ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2023 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру (далей – Конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з'яўляюцца: стымуляванне творчай актыўнасці і павышэнне ўзроўню сцэнічнай культуры мастацкіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў размоўнага жанру; накапленне і сістэматызацыя здабыткаў вуснай народнай творчасці; узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва сродкамі фальклорнага і сучаснага эстраднага мастацтва (паэтычная і празаічная формы); павышэнне прафесійнага ўзроўню і распаўсюджванне творчага вопыту.

3. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (Дадатак 1).

4. Конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.

5. Конкурс праводзіцца ў 2 туры:

I тур – раённыя (гарадскія) конкурсы (люты - жнівень) падчас якога праглядаюцца і адбіраюцца лепшыя выканаўцы (творчы калектыў, асобны выканаўца) рэгіёну для ўдзелу ў II тур - абласны. У тэрмін **да 1 верасня** падача заявак суправаджаецца пратаколам, фота-, відэа- і іншымі матэрыяламі, якія пацвярджаюць правядзенне I тура.

II тур – абласны, заключны этап – **20 кастрычніка** ў якім прымаюць удзел лепшыя выканаўцы (творчы калектыў, асобны выканаўца), якія прайшлі папярэдні адбор па выніках I тура – не больш 3-х ад раёна, акрамя Лідскага раёна і г.Гродна – не больш 6-ці.

6. У Конкурсе могуць прымаць удзел калектывы аматарскай творчасці і індывідуальныя выканаўцы размоўнага жанру незалежна ад ведамаснай прыналежнасці і без абмежавання ўзросту.

7. Канкурсанты рыхтуюць да выканання празаічныя альбо паэтычныя творы мастацкага слова агульнай працягласцю да 5 хвілін у выглядзе паўнавартаснага канцэртнага нумару размоўнага жанру.

8. Мастацкая якасць нумароў павінна адпавядаць узроўню канцэртаў абласнога маштаба.

9. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I, II, III месца) у рамках і прызамі ў дзвух узроставых катэгорыях (дзіцячай і дарослай) у наступных намінацыях:

народная проза (легенды, паданні, апавяданні, казкі);

проза, інсцэніроўка празаічнага твора;

паэзія, інсцэніроўка паэтычнага твора;

камедыйна-сатырычныя творы (гумарэскі, байкі, інтэрмедыі, анекдоты, пародыі).

10. Асобныя калектывы і выканаўцы ў дзвух узроставых катэгорыях (дзіцячай і дарослай) узнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі ў рамках і прызамі:

- “За ўдалае ўвасабленне аўтарскага твора”;
- “За ўдалы дэбют”, “За лепшы аўтарскі твор”;
- “За акцёрскае майстэрства”;
- “За ўвасабленне традыцый беларускага гумару”;
- “За ўдалае ўвасабленне актуальнай тэмы”;
- “За лепшае раскрыццё тэмы вайны”;
- “За лепшае ўвасабленне твора беларускай класікі”.

11. Астатнія ўдзельнікі Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

12. Журы (Дадатак 2) пакідае за сабой права пры адсутнасці конкурсу ў адной з намінацый альбо катыгорый аб’ядноўваць іх альбо змяняць, уводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Конкурсу, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатам.

13. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

- адпаведнасць мэтам і задачам Конкурсу;
- сцэнічная культура і культура мовы;
- мастацка-эстэтычны ўзровень рэпертуару, выкарыстанне сучаснага і рэгіянальнага матэрыялу;
- арыгінальнасць манеры выканання, артыстызм.

14. З мэтай творчай вучобы на Конкурс запрашаюцца кіраўнікі тэатральных калектываў, кіраўнікі гурткоў мастацкага слова.

15. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна даслаць заяўку (Дадатак 3) **да 1 верасня 2023 года** па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Тэл. +375 152 623803, +375 29 5873956, тэл/факс: +375 152 623787, e-mail: info@gromc.by.

16. Фінансаванне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: заработная плата вядучаму; набыццё прызоў і спецыяльных прызоў, дыпломаў і рамак; тэхнічнае забеспячэнне мерапрыемства, кампенсацыя камунальных паслуг.

17. Для фінансавання Конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Конкурсу (у іншыя тэрміны).

19. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў і выканаўцаў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | - | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пекар А.Ю. | - | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Рабцава А.Л. | - | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Рамановіч Н.І. | - | намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру

| | | |
|---|---|---|
| Закрэўская Г.В. | - | вядучы майстар сцэны ДУК “Гродзенскі абласны тэатр лялек”, *старшыня журы;* |
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпралення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Шыплюк А.І. | - | выкладчык тэатральных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, *намеснік старшыні журы;* |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятроўская М.А. | - | выкладчык тэатральных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Рабцава А.Л. | - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Хільмончык К.В. | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да інструкцыі аб арганізацыі і
правядзенні абласнога
конкурсу выканаўцаў
размоўнага жанру

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
гаррайвыканкама
2023 г.

## ЗАЯЎКА
## на ўдзел у абласным конкурсе выканаўцаў размоўнага жанру

1. Базавая ўстанова дзейнасці (поўная назва) ______________________________
2. Намінацыя *(неабходнае падкрэсліць)*
   - народная проза (легенды, паданні, апавяданні, казкі);
   - проза, інсцэніроўка празаічнага твора;
   - паэзія, інсцэніроўка паэтычнага твора;
   - камедыйна–сатырычныя творы (гумарэскі, байкі, інтэрмедыі, анекдоты, пародыі)
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка (ці назва калектыву)____________
_______________________________________________________________________
4. Узрост удзельніка(аў)_____________________________________________
5. Месца працы (вучобы) удзельніка(аў)_________________________________
6. Назва твора, аўтар *(для фальклорных твораў - калі і ад каго запісаны)*
_______________________________________________________________________
7. Працягласць выступлення __________________________________________
8. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву ___________
_______________________________________________________________________
9. Пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выдадзены) мастацкага кіраўніка калектыву ці асобнага выканаўцы________________________________________
_______________________________________________________________________
_______________________________________________________________________
10. Неабходнае тэхнічнае забеспячэнне, гукавы носьбіт
_______________________________________________________________________
11. Кантактныя тэлефоны_______________________________________________

Кіраўнік базавай установы ____________________
*(подпіс)*

Заяўкі на ўдзел у конкурсе, а таксама электронную версію конкурснага твора дасылаць да 1 верасня па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ, e-mail: info@gromc.by з паметкай “на конкурс выканаўцаў размоўнага жанру”.
Тэл. +375 152 623803, +375 29 5873956, тэл/факс: +375 152 623787